# КАСМІЧНЫ КОД КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ У ФРАЗЕАЛОГІІ

**А. А. Чэкан**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны», Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік В. А. Ляшчынская, д-р філал. навук, прафесар

Створаныя культурнай дзейнасцю чалавека каштоўнасці фіксуюцца ў мове. І фразеалагічныя адзінкі (ФА) выступаюць адным з важнейшых сродкаў выражэння і фіксацыі культурных сэнсаў. Вось чаму ФА ў апошні час асабліва прыцягальныя для вывучэння і пазнання: ФА «выступаюць такімі культурнымі знакамі, якія трэба “прачытваць”», з’яўляюцца крыніцай пазнання культуры свайго народа, яго менталітэту, складу розуму [1, с. 160]. І адным з культурных кодаў, што складаюць фразеалагічную карціну свету беларусаў, з’яўляецца касмічны код, які разумеецца як сукупнасць найменняў касмічнай прасторы, што нясуць у дадатак да сваіх прыродных уласцівасцей функцыянальна значныя для культуры сэнсы, што і надаюць гэтым найменням ролю знакаў мовы культуры.

Касмічны код культуры прадстаўлены амаль 20 ФА з кампанентамі-найменнямі касмічных аб’ектаў *сонца*, *зорка*, *месяц*. Паўстаюць пытанні, чаму толькі тры

лексемы абраны цэнтрамі вобразаў беларускіх ФА, якую ролю яны выконваюць у складзе ФА як другасных адзінак мовы паводле свайго ўтварэння, ці звязана і як з культурнай інфармацыяй ФА, якія, акрамя свайго значэння, даводзяць нам, інфармуюць нас.

Вядома, што ў фразеалогіі існуе ўніверсальны закон, паводле якога, па-першае, не ўсе лексемы мовы скарыстаны ў фразеалогіі, а толькі асобныя. Па-другое, такімі лексемамі-кампанентамі ФА, паводле назіранняў даследчыкаў, лічацца тыя, што становяцца знакамі, культурнымі сімваламі рознай ступені значнасці ў тую ці іншую эпоху ў таго ці іншага народа. Іншымі словамі, яны адбіраюцца з ліку многіх, за якімі ўжо ў дафразеалагічны перыяд замацавалася пэўная культурная ацэнка, якія набылі ролю культурных сімвалаў, эталонаў. Становіцца зразумелым адбор лексем *сонца*, *зорка*, *месяц* як асновы вобразаў ФА, так як гэтыя лексемы сталі знакамі культуры ўсяго чалавецтва і беларусаў у тым ліку з прычыны надання гэтым словам ролі знакаў каштоўнасных сэнсаў на аснове ўсведамлення нашых далекіх продкаў пра важнейшыя свяцілы, з якімі з мінулых часоў былі звязаны розныя ўяўленні і асэнсаванні свету і сябе ў свеце.

У прыватнасці, паводле міфалагічных уяўленняў, «*сонца* – вялізнае касмічнае («Божае») вогнішча, якое «грэе неба, каб там было цёпла». Пры гэтым яно выступае найвышэйшым увасабленнем касмічнага агню наогул. < .. > У пазнейшай інтэрпрэтацыі *сонца* мае круглую форму таму, што Бог паставіў перад ім з боку зямлі вялікае круглае павелічальнае шкло. З бачнай формай *сонца* звязана традыцыйнае параўнанне яго з «вялікім калясом», якое коціцца па небе, як, напрыклад, у загадках: «Кацілася катушка, ні звер, ні птушка…» [2, с. 455]. Гэта так званае наіўнае ўсведамленне і тлумачэнне такога неспазнанага паняцця, як сонца. А на аснове назірання за рухам сонца – заходам і ўсходам, адпаведна цемрай і святлом на зямлі і асацыятыўнай сімволікай «шчасце – няшчасце», «святло – цемра» на базе свабодных дзеяслоўных словазлучэнняў утвараюцца ФА *сонца ўзыходзіць* ‘для каго-н. наступае шчасце, што-н. новае, вельмі значнае ў жыцці’ і *сонца зайшло* ‘скончылася чыё-н. шчасце, поспехі і пад.’ як вобразныя выразы для абазначэння супрацьлеглых абстрактных паняццяў, якія існуюць у жыцці, вызначаюць лёс чалавека, для іх ацэнкі, для выражэння экспрэсіі і эмоцыі.

Паводле блізкасці сімволікі, ці дакладней, нададзенай лексеме сонца эталанізацыі, да вышэй названых набліжаецца створаная ФА з празрыстай матывацыяй *месца пад сонцам* як вобразны сродак для абазначэння ацэнкі і выражэння адносін да такіх паняццяў, як увогуле існаванне чалавека ў свеце і яго месца сярод людзей, што і засведчана семантыкай ФА *месца пад сонцам* – 1) ‘трывалае, высокае становішча ў грамадства’ і 2) ‘права на існаванне’.

З уяўленнямі пра сонца як сімвалам святла, яснасці, праўдзівасці звязана ўтварэнне ФА *за вушка ды на сонейка* са значэннем ‘распраўляцца з кім-н., выкрываць, прыцягваць да адказнасці’ і якая служыць для перадачы стэрэатыпнага ўяўлення беларусаў пра непазбежнасць выкрыцця чыіх-небудзь няправільных дзеянняў, махінацый і падобных негатыўных спраў. Такім вобразам, у цэнтры якога абрана сонца як не проста найменне нябеснага свяціла, а менавіта як адзінкі-сімвала свету ў супрацьлегласць цемры, сімвала справядлівасці, ФА даводзіць да свядомасці чалавека правіла, паводле якога чалавек не павінен рабіць заганныя ўчынкі, паводзіць сябе няправільна, думаючы гэта скрыць, паколькі ўсё роўна стане вядома, рана ці позна.

А вось ужо з іроніяй і насмешкай успрымаецца ўтвораная з выкарыстаннем кампанента *сонца* субстантыўная ФА *цыганскае сонца* са значэннем ‘начное свяціла,

месяц' і якая найперш выражае ацэнку, характарызуе, перадае ўяўленні беларусаў з выкарыстаннем такога свяціла як сродку адметнасці заняткаў у начны час, паводле способу «дзейнасці» і шчаслівага, бесклопатнага існавання такога народа, як цыганы.

З выражэннем жартоўных адносін і, галоўнае, для падкрэслівання дадатковай інфармацыі ў адносінах для тых, хто смяецца, утворана ФА *зубы грэць на сонцы* 'весела смяяцца, рагатаць, не займаючыся справай', якая дапаўняе сінанімічны рад фразеалагізмаў з кампанентам *зубы* як паказчыкам суаднесенасці адзінак з цялесным кодам культуры тыпу *выскаляць зубы*, *прадаваць зубы*, *скаліць зубы*, *сушыць зубы* з агульным значэннем 'смяяцца'. У выніку ФА *зубы грэць на сонцы* вобразна, дакладна, сціслa па форме і надзвычай эмацыянальна паводле зместу перадае ўсе гэта пры камунікаванні, выражае адносіны, вобразна і эмацыянальна характарызуе такі эмацыянальны стан чалавека.

Лексема *зорка* – гэта яшчэ адзін кампанент амаль дзясятка ФА, што рэпрэзентуюць касмічны код культуры, а яе адбор, несумненна, матываваны і звязаны са старажытнымі, міфалагічнымі, наіўнымі ўяўленнямі нашага і іншых народаў у далекім мінулым пра зорку як адзін з самых старажытных агульначалавечых сімвалаў, як астральны знак, як сімвал вечнасці. Так, у славянскім фальклоры зоркі выступаюць як «дзеці» сонца і месяца. З імі суадносяцца паняцці святла і розуму, жыцця і смерці, існавання і знікнення чалавека, шчасця і няшчасця, што ўтрымліваюць і даносяць ФА *хапаць зоркі з неба* 'здзяйсняць што-н. выключнае, выдатнае' як сродак выражэння адабрэння і з супрацьлеглай ацэнкай ФА *зорак з неба не хапае* 'мае сярэднія здольнасці, не вылучаецца незвычайным талентам, розумам і пад.', якія адрасаваны да чалавека, па-рознаму характарызуюць і ацэньваюць чалавека, яго дзеянні ці якасці. Паводле еўрапейскай традыцыі *зорка* – эмблема шчасця, што з'яўляецца агульным у сімволіцы зоркі для розных народаў, у тым ліку і беларусаў. І гэта сімволіка лексемы *зорка* паслужыла асновай утварэння шэрагу ФА з гэтым кампанентам: *нарадзіцца* (*радзіцца*) *пад шчаслівай зоркай* – 'быць удачлівым, шчаслівым, мець поспех у сваіх справах', *зорка ўзыходзіць* – 'для каго-н. наступае што-н. новае, вельмі значнае ў жыцці' (параўн. сінанімічную ФА *сонца ўзыходзіць*), *узыходзячая зорка* – 'чалавек, які пачынае набываць шырокую вядомасць, вялікую славу ў якой-н. галіне дзейнасці', *зорка першай велічыні* – 'вельмі славуты ў якой-н. сферы дзейнасці чалавек', *пуцяводная зорка* – 'тое, што накіроўвае, вызначае чыю-н. дзейнасць, жыццё' і 'чалавек, які вызначае чыю-н. дзейнасць, жыццё'. І кожная з названых ФА па-рознаму даводзіць пра станоўчае, высокае ў чалавеку на аснове асацыяцыі з уяўленнямі пра зорку, яе сімволікай, з тым, што гэта лексема стала найменнем сімвала высокага, шчаслівага, ці такой зоркі, пра якую кажуць, што яны «нараджаюцца», «спяць», «ходзяць», «уцякаюць», «купаюцца», «гуляюць», «кажуць» і інш. І гэта абумоўлена найперш тым, што, паводле агульнаславянскіх паданняў, зоркі непарыўна звязаны з лёсам чалавека: зорак на небе столькі, колькі людзей на зямлі; з нараджэннем чалавека «запальваецца» зорка (ці Бог, анёлы запальваюць «свечку»); зорка расце разам з чалавекам, а затым падае на зямлю або згасае, як свечка, калі ён паміраe; калі зорка чалавека «моцная», то ён спраўляецца са сваімі бедамі, калі «слабая», то і ён слабы. І такія ФА, як *зорка закацілася* (*патухла*) 'скончылася чыё-н. шчасце, поспехі, кар'ера і пад.' ці *да першай зоркі* 'ненадзейна, з малой верагоднасцю на здзяйсненне чаго-н.', становяцца больш зразумелымі, калі вядома тая культурная інфармацыя, той культурны фон, што замацаваліся і стаяць за гэтай лексемай, нададзены ей, дзякуючы ўяўленням чалавека пра зоркі ў далекім мінулым, пра такое спасціжэнне і разуменне свету, пра выпрацаваныя ў мінулым культурныя ўстаноўкі.

Толькі тры ФА выяўлены з кампанентам *месяц*. З іх ФА *мядовы месяц* ‘пачатак сямейнага жыцця’ звязана з найменнем перыяду часу (*месяц* – 1) ‘планета, самая блізкая да зямлі’; 2) ‘дванаццатая частка астранамічнага года, у якой ад 28 да 31 дня’), паколькі месяц паўсюдна з'яўляецца сімвалам цыклічнага рытму часу, неўміручасці і вечнасці, пастаяннага абнаўлення. Іншая культурная інфармацыя даводзіцца ФА *з неба* (*з месяца*) *зваліўся* і кампаратыўная ФА *як з месяца зваліўся* з агульным значэннем ‘не разумееш таго, што відавочна ўсім’, якія ілюструюць сімволіку супрацьлегласці, ці антыподы «неба – зямля», «высока – нізка», «невядомае – вядомае», суадносяць уяўленні чалавека пра самога сябе, зыходзячы з уяўленняў «светла – цемна», «зразумела – незразумела», якія вобразна даводзяць негатыўную ацэнку і служаць для выражэння адносін аднаго чалавека да другога, калі тыя не разумеюць чагосьці відавочнага, яўнага.

Такім чынам, касмічны код культуры беларусаў, рэпрэзентаваны фразеалагічнымі адзінкамі беларускай мовы, іх вобразамі з кампанентамі *сонца*, *зорка*, *месяц*, прадстаўлены нешматлікімі адзінкамі фразеалогіі, але менавіта яны з’яўляюцца сродкам пазнання спосабаў мыслення нашага народа ў далекім мінулым, сродкам «прачытання» сутнасці і назначэння гэтых адзінак мовы. Яны садзейнічаюць больш поўнаму разуменню сэнсу і скрытаму зместу, той культурнай інфармацыі, што даводзяць гэтыя адзінкі нашай мовы, спрыяе пазнанню ведаў, мудрасці, правіл і ўстановак нашага народа. І такое «прачытанне» фразеалагізмаў з кампанентамі *сонца*, *зорка*, *месяц* дазваляе гаварыць пра спосаб мыслення чалавека ў мінулым, якое ў асноўным было метафарычным, выяўляе светаўспрыманне і светаразуменне нашых продкаў, тыя веды, што былі асновай жыцця чалавека ў мінулым. Фразеалагізмы, у тым ліку і з кампанентам *сонца*, *зорка*, *месяц*, даносяць інфармацыю сваім нязменным зместам і формай да новых пакаленняў, тым самым яднаючы іх са сваім народам. Фразеалагізмы выразна і вобразна, дакладна і сцісла адлюстроўваюць пачуццёва-эмацыянальны свет чалавека, фіксуюць сімволіку, якой надзялялі нашы продкі словы, у тым ліку і лексемы для наймення астранамічных паняццяў, якія ў мінулым набылі сваю сімволіку і перадалі яе ўтвораным з імі фразеалагічным адзінкам для выказвання ацэнкі, для характарыстыкі, для выражэння адносін да ўсяго, што мае важнейшы сэнс у жыцці чалавека, пра самога сябе ў свеце.

Літаратура

1. Ляшчынская, В. А. Ідыяматыка беларускай мовы ў лінгвакультуралагічным асвятленні / В. А. Ляшчынская. – Мінск : РІВШ, 2019. – 250 с.
2. Санько, С. Сонца / С. Санько, Я. Сахута // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд.: Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – С. 455–456.